цыягам. Тым больш, што віцебскія меншавікі-інтэрнацыяналісты і міжраёнцы адкрыта прызналі стратэгію і тактыку ЦК РСДРП(б) на давядзенне рэвалюцыі да перамогі дыктатуры пралетарыяту. Недахопам жа руху варта прызнаць уступку, якую зрабілі бальшавікі сваім саюзнікам у вызначэнні назвы арганізацыі. Вядома, характар арганізацыі вызначаецца не столькі назвай, колькі зместам яе дзейнасці. Але, калі ўлічыць, што да таго часу ў свядомасці працоўных слова бальшавік замацавалася як паняцце «паслядоўны марксіст-рэвалюцыянер», да канца адданы справе рабочага класа, справе камунізму, то, несумненна, што ўзяўшы агульнапрынятую да таго часу назву РСДРП(б), Віцебская арганізацыя тым самым адразу прыцягнула б да сябе больш прыхільнікаў, узмацніла б свой уплыў на рабочых і працоўнае сялянства.

Слаба вывучаным пакуль з'яўляецца напрамак дзейнасці бальшавікоў у паветах і валасцях Віцебскай губерні. Мяркуючы па існуючых даных, з чатырох тысяч членаў РСДРП прыкладна чацвёртая частка падзяляла марксісцка-ленінскія погляды. Непасрэдна ў паветах каля 100 сацыял-дэмакратаў бальшавікоў рыхтавалі масы да будучых бітваў.

Так, крок за крокам надыходзіў час практычных дзеянняў: выканання рашэнняў VI з'езда РСДРП(б) аб правядзенні ўзброенага паўстання. Пралетарыят і працоўнае сялянства Віцебскай губерні, салдаты, расквартараваныя на яе тэрыторыі, трымалі раўненне на Петраград: там перш за ўсё вырашаўся лёс рэвалюцыі. Але працэс барацьбы за ўладу Саветаў быў адзіным, узаемазвязаным, калі поспех вядучага атрада пралетарыяту ў цэнтры аблягчаў, паскараў перамогу на месцах, а поспехі працоўных на месцах замацоўвалі заваяваныя пазіцыі ў цэнтры.

[1] Гл.: Ленін У. І. Творы. Т. 23. С. 286.
[2] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 49. С. 411.
[3] Гл.: Кнорин В. 1917 год в Белоруссии и на Западном фронте. Минск, 1925. С. 9.
[4] Партархіў Віцебскага АК КПБ. Ф. 10050, воп. 1, спр. 1, арк. 73.
[5] Там жа. Арк. 4, 23.
[6] Там жа. Спр. 2, арк. 33.
[7] Известия Витебских Советов крестьянских, солдатских и рабочих депутатов. 1917. 26 авг.
[8] Там жа. 1917. 20 июля.
[9] Красная быль. Витебск, 1923. С. 57, 62.
[10] Там жа. С. 198.

Е. Ф. САЎЧУК

## «АНТЫВАЕННЫ ТЫДЗЕНЬ» У БЕЛАРУСІ Ў СУВЯЗІ З 10-ГОДДЗЕМ З ПАЧАТКУ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Дзесяцігоддзе з пачатку першай сусветнай імперыялістычнай вайны V кангрэс Камінтэрна вырашыў адзначыць «Інтэрнацыянальным тыднем барацьбы супраць імперыялістычнай вайны і сацыял-здрадніцтва», які праводзіўся с 27 ліпеня па 4 жніўня 1924 года. Ён меў характар міжнароднай палітычнай акцыі супраць імперыялізму, росту мілітарызму і пагрозы вайны, у абарону міру. Як адзначалася ў пісьме выканкома Камінтэрна «Усім ЦК кампартый» ад 11 чэрвеня 1924 года, інтэрнацыянальны антываенны тыдзень праводзіўся з мэтай «падрыхтаваць масы да рашучай барацьбы супраць вайны; папулярызаваць думку аб неабходнасці пераўтварэння ўсялякай спробы імперыялістычнай вайны ў рэвалюцыйную, класавую вайну; падтрымаць усімі сродкамі і спосабамі Саюз Савецкіх Рэспублік у яго барацьбе за раззбраенне і мір; разгарнуць вялікую кампанію супраць занявольвання народаў Усходу». Адначасова ставілася задача выкрываць сацыял-здрадніцтва лідэраў II Інтэрнацыянала [1].

Гэты і другія дакументы, звязаныя з правядзеннем «антываеннага тыдня» адлюстроўваюць погляд на камуністычныя партыі як авангардную сілу антываеннага руху, на ролю СССР як фарпост міралюбівых сіл у барацьбе за раззбраенне і мір. Разам з гэтым у іх знайшоў адлюстраванне сектанцкі падыход да праблем міжнароднага антываеннага руху, які адсякаў ад удзелу ў сумесных антываенных акцыях тую частку рабочага класа, працоўных замежных краін наогул, якія знаходзіліся пад уплывам сацыял-дэмакратыі, ішлі за ёй. Базумоўна, сказалася і тое, што ў пачатку 1924 го-

да І. В. Сталін выказаў пастулат аб тым, што адбылася перагрупоўка дробнабуржуазных сіл у бок контррэвалюцыі, у лагер фашызму. З гэтага рабіўся вывад для палітычнай практыкі: «Не кааліцыя з сацыял-дэмакратыяй, а смяротны бой з ёй, як з апорай цяперашняй фашызіраванай улады»[2]. Усё гэта накладвала негатыўны адбітак на тлумачальную работу партыі ў масах, адлюстроўвалася ў лозунгах, пад якімі праходзілі антываенныя выступленні працоўных БССР.

«Антываенны тыдзень» у сувязі з 10-годдзем з дня пачатку першай сусветнай вайны прайшоў ва ўсіх савецкіх рэспубліках. У БССР ён стаў важным элементам грамадска-палітычнага жыцця. У справаздачах агітацыйна-прапагандысцкіх аддзелаў мясцовых партарганізацый ён па праву называўся адной з самых значных палітычных кампаній 1924 года. Яна выйшла далёка за рамкі тлумачальнай работы партыі ў масах, як гэта ўяўлялася ўпачатку, і вылілася ў шырокі рух мас у падтрымку міру, іх пратэсту супраць вайны, з'явілася сапраўдным праяўленнем інтэрнацыяналізму.

Дакументальныя матэрыялы, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем антываеннага тыдня ў Беларусі дазваляюць зразумець характар антываеннага руху тых год у БССР, адносіны шырокіх мас насельніцтва да пытанняў вайны і міру, вызначыць дамініруючыя пачуцці грамадскай свядомасці ў адносінах да ваеннай пагрозы. З поўным правам можна сцвярджаць, што імі было зразуменне неабходнасці рабіць усё магчымае, каб не дапусціць узнікнення пажара новай вайны. Магчымасць гэтага шырокія масы рэспублікі бачылі ва ўмацаванні гаспадарчага і ваеннага патэнцыялу краіны, інтэрнацыянальнага адзінства працоўных усіх краін у барацьбе супраць пагрозы вайны, супраць капіталу — віноўніка ўсялякіх войнаў.

У сэрцах рабочых і сялян Беларусі, асабліва іх пралетарскага авангарду, жыла надзея на сусветную рэвалюцыю, якая прывядзе да знікнення прычын войнаў. Яны выказвалі гатоўнасць падтрымаць усімі сіламі і сродкамі барацьбу замежнага пралетарыяту за звяржэнне ўлады капіталу. Безумоўна, на гэтых настроях сказваліся як пачуцці пралетарскага інтэрнацыяналізму, класавага братэрства працоўных Беларусі з пралетарыятам замежных краін, так і інерцыя думкі, ідэалагічная догмы агітацыйна-прапагандысцкай работы партыйных, камсамольскіх арганізацый Беларусі адносна перспектыў сусветнай рэвалюцыі. Хаця аб'ектыўныя магчымасці яе хуткай перамогі перасталі быць рэальнасцю, у палітычнай прапагандзе КП(б)Б панавала думка, што ўсе краіны ў недалёкім будучым пойдуць услед прыкладу Савецкай Расіі. Рэцыдывы левакамуністычных падыходаў да праблемы сусветнай рэвалюцыі ўсё яшчэ мелі дастатковую распаўсюджанасць. Усё гэта адбілася на антываеннай кампаніі ў Беларусі ў сувязі з 10-годдзем пачатку першай сусветнай вайны.

Але антываенны тыдзень у Беларусі раскрыў і другое. Размах антываенных выступленняў сведчыў аб імкненні працоўных Беларусі да міру, іх інтэрнацыяналісцкіх пазіцыях, аб тым, што антываенны рух увогуле па сваёй сутнасці з'яўляецца інтэрнацыяналісцкім. У авангардзе руху рабочых і сялян Беларусі супраць вайны знаходзіліся арганізацыі КП(б)Б. Яны паўсямесна праводзілі вялікую арганізатарскую і тлумачальную работу, узначалілі ўсенародны рух у абарону міру. Аб гэтым сведчаць шматлікія дакументы.

Павятовыя камітэты партыі разаслалі ўсім кам'ячэйкам пісьмы аб падрыхтоўцы, характары і змесце працы ў ходзе гэтай кампаніі. Галоўная ўвага ў тлумачальнай рабоце канцэнтравалася на наступных момантах: пагроза новай вайны ў сувязі з канфліктамі розных капіталістычных груп і ростам узбраення; выкрыццё ролі II Інтэрнацыянала як памагатага падрыхтоўкі вайны, тлумачэнне, што толькі рэвалюцыя можа папярэдзіць вайну, мір можа забяспечыць толькі перамога сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. Былі сфармуляваны лозунгі кампаніі, у іх ліку: «Вайна — вайне!» — баявы лозунг сусветнага пралетарыяту»; «У перамозе сусветнай рэвалюцыі — залог міру на зямлі»; «Наш лозунг — замест імперыялістычнай вайны вайна грамадзянская, замест царства капітала — сусветны саюз савецкіх сацыялістычных рэспублік»; «Папярэдзім вайну, раздзьмуўшы горн пралетарскай рэвалюцыі» і інш.[3]

Як відаць, у гэтых рэкамендацыях і лозунгах адлюстраваліся, з аднаго боку, жаданне падняць шырокія колы насельніцтва на энергічны пратэст супраць пагрозы новай вайны (лозунг «Вайна — вайне»), з другога боку, — характэрныя для таго часу ўяўленні аб блізкай перамозе сусветнай пралетарскай рэвалюцыі, жаданне непасрэдна звязаць антываенныя выступленні пралетарыяту капіталістычных краін з задачай звяржэння панавання капі-

тала, з барацьбой за перамогу сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. Ва ўмовах СССР такія ўяўленні і перабольшанне не змяншалі размах антываенных выступленняў працоўных. На Захадзе яны шкодзілі згуртаванню ўсіх сіл, якія выступалі супраць вайны, але не гатовы былі падтрымаць лозунгі сусветнай рэвалюцыі і ўстанаўлення дыктатуры пралетарыяту.

КП(б)Б, абапіраючыся на грамадскія арганізацыі, правяла вялікую палітычную работу дзеля падрыхтоўкі і правядзення «інтэрнацыянальнай нядзелі барацьбы супраць імперыялістычнай вайны» у сувязі з 10-годдзем пачатку першай сусветнай вайны, паслядоўна выконвала ў антываенным руху працоўных сваю авангардную ролю. Гэта з'явілася адным з рашаючых фактараў шырокага народнага выступлення супраць пагрозы вайны ў дні «тыдня», якое ахапіла ўсю Беларусь. Другім фактарам, які вызначыў усенародны характар пратэсту працоўных БССР супраць росту мілітарызму ў капіталістычных краінах і ўзрастаючай ваеннай пагрозы быў уласны вопыт насельніцтва Беларусі, які яно набыло ў гады мінулай сусветнай вайны і ваеннай інтэрвенцыі імперыялістаў; памяць аб тых ахвярах, бедствах, нягодах, якія прынесла з сабой на беларускую зямлю імперыялістычная вайна і напад іншаземных імперылістаў на маладую Савецкую дзяржаву.

БССР знаходзілася на мяжы двух сусветаў. Смерч вайны бушаваў на тэрыторыі Беларусі на працягу 7 год—з 1914 па 1920 год. Ваенныя правакацыі не спыняліся і пасля заключэння міру з Польшчай. У выпадку ваеннага пажару Беларусія непазбежна ператварылася б у арэну баявых дзеянняў. Вось чаму працоўныя рэспублікі так востра рэагавалі на ўсялякае ўскладненне міжнароднага становішча, на ўзрост ваеннай пагрозы і мілітарызму, так рашуча і цвёрда выступалі супраць вайны, у абарону міру, непадзельна падтрымлівалі міралюбівы знешнепалітычны курс урада СССР, выказвалі гатоўнасць намагчы ўсе сілы для ўмацавання абараназдольнасці краіны. Працоўныя Беларусі ведалі, памяталі, што такое вайна.

Калектыўным арганізатарам, прапагандыстам ідэй барацьбы за мір у пэўным сэнсе гэтага слова з'яўляўся партыйна-савецкі друк, асабліва газета «Звязда»—орган ЦК КП(б)Б. У ліпені-жніўні 1924 года тэма антываеннага руху ў сувязі з 10-годдзем пачатку першай сусветнай вайны была ў газеце адной з цэнтральных. У друку змяшчаліся адозвы партыйных, дзяржаўных, грамадскіх арганізацый, карэспандэнцыі аб ходзе антываенных сходаў, мітынгаў, дэманстрацый ва ўсіх кутках рэспублікі, выступленні на іх рабочых, сялян, прынятыя імі рэзалюцыі пратэсту супраць вайны, пісьмы рабочых і сялян ў газету аб іх адносінах да пытання вайны і міру, заклікі працоўных калектываў, асобных рабочых і сялян да замежнага пралетарыяту да адзінства дзеянняў супраць пагрозы вайны, з праяўленнем салідарнасці з іх рэвалюцыйнай барацьбой. Змяшчаліся антываенныя вершы, апавяданні, успаміны, дакументы, статыстычныя даныя, дыяграмы аб мінулай вайне. Сістэматычна друкаваўся раздзел «Што чытаць пра вайну», у якім рэкамендаваліся працы У. І. Леніна, папулярная марксісцкая літаратура пра вайну.

27 ліпеня 1924 года «Звязда» выйшла на шасці старонках, пяць з якіх былі прысвечаны «крываваму юбілею». «Звязда» заклікала змагацца супраць вайны, пакуль не позна. «Нельга барацьбу супраць мілітарызму адкладваць да таго часу, калі вайна пачнецца, бо тады ўжо будзе позна»,— справядліва гаварылася ў артыкуле «Крывавы юбілей». 3 жніўня была надрукавана адозва ЦК КП(б)Б «Усім рабочым і сялянам». Сваім зместам яна абуджала жаданне актыўна змагацца супраць мілітарызму і вайны. Адозва тлумачыла: пакуль існуе капіталізм—існуе пагроза нападзення на СССР. Працоўныя рэспублікі заклікаліся да упартай працы над адраджэннем эканомікі, да ўмацавання братэрскага Саюза Савецкіх Рэспублік, сцяганосца міру, міжнароднай салідарнасці працоўных.

У дні «тыдня» шырока распаўсюджваліся розныя дакументальныя і тэарэтычныя матэрыялы аб вайне і антываенным руху за мяжой. Вялікае ўраджанне астаўляла публікацыя дакументаў і фактаў—праўда аб мінулай вайне і ваенных прыгатаваннях да будучай бойні. Але самым хвалюючым, самым дасканалым матэрыялам, які сведчыў аб жаданні працоўных Беларусі зрабіць ўсё магчымае, каб не дапусціць вайны, жывым апавяданнем аб тым, што нясе вайна чалавеку-працаўніку, з'яўляюцца рэзалюцыі антываенных сходаў і мітынгаў, якія праходзілі ў тыя дні па ўсёй Беларусі, выступленні на іх рабочых і сялян, іх пісьмы ў газету. На працягу доўгага часу спачатку пад рубрыкай «Наш пратэст», а з 5 жніўня 1924 года пад рубрыкай «Вайна—вайне» на старонках «Звязды» друкаваліся дакументы, якія сведчылі, што ў антываенных сходах, мітынгах, дэманстрацыях прынялі

ўдзел усе слаі насельніцтва БССР. Гэта сапраўды ўсенародны рух, у авангардзе якога быў рабочы клас. Антываенныя сходы, мітынгі, дэманстрацыі прайшлі паўсюдна, былі многалюднымі, давалі магчымасць кожнаму асабіста ўзвысіць голас супраць пагрозы вайны.

З выключным уздымам прайшла агульнагарадская дэманстрацыя пратэсту супраць імперыялістычнай вайны ў Мінску. «Доўгі спіс нястач, якія абрушыліся на мінскіх рабочых у выніку злачыннай вайны. Дэманстрацыя прыцягнула і ўсё астатняе насельніцтва горада, бо мала такіх, каго вайна не зачапіла. Супраць вайны пратэставалі ўсе»,— пісаў у газету ўдзельнік гэтай дэманстрацыі. Яго карэспандэнцыя дае падрабязнае і яркае апісанне дэманстрацыі і мітынга, які тады адбыўся. «Людскія хвалі залілі гарадскі сад. Выступалі прадстаўнікі ЦК, затым рабочыя, работніцы, камсамольцы, чырвонаармейцы. Выступіла і адна старая жанчына: «Ня трэба нам болей крыві. Смерць буржуям. Забілі майго сына і брата... Ня трэба болей войнаў»[4]. У гэтых словах простай жанчыны боль і воля ўсёй Беларусі. «Вайна — вайне — гэты лозунг над калонамі дэманстрантаў паўней другіх адлюстроўваў пазіцыю працоўных Мінска.

Тыя ж пачуцці і ў выступленнях і рэзалюцыях сялян Беларусі. Паўсюдна адбыліся сходы, мітынгі, дэманстрацыі. Рэзалюцыі пратэсту супраць ваеннай пагрозы сяляне прымалі і на сваіх канферэнцыях, і ў «дні селяніна», якія ў чэрвені 1924 года праходзілі ў шэрагу паветаў Беларусі. «Усюды пасля дакладаў выступалі сяляне, жанчыны, інваліды, удовы салдат, якія загінулі на імперыялістычнай вайне»,— адзначалася ў артыкуле «Вёска аб вайне»[5]. Іх выступленні сведчаць аб гарачым жаданні не дапусціць новага ваеннага ліхалецця, знішчыць прычыны войнаў. Сяляне выказвалі гатоўнасць аказваць дапамогу замежным працоўным у іх барацьбе супраць капіталізму.

Вельмі часта ў час сходаў сяляне запісваліся ў МОПР, дабраахвотныя абаронныя таварыствы, паказваючы гэтым разуменне неабходнасці справамі дапамагчы замежным барацьбітам рэвалюцыі, умацоўваць абароназдольнасць сваёй краіны. Дамініруючым пачуццём сялянскай свядомасці было жаданне міру. Аб гэтым сведчаць многія факты. Так, на хутары Мілеры сабраліся хутаране Мілераў, Малінаўкі, Гумнішчаў, каб выразіць свой пратэст супраць імперыялістычнай вайны. Пасля даклада аб 10-годдзі імперыялістычнай вайны, калі пачаўся запіс у МОПР, стары селянін Францкевіч сказаў: «Мы дамо і па 15 капеек (мопраўскі ўзнос — 5 кап.— Е. С.), толькі б справа рэвалюцыі выйграла на Захадзе. Тады і вайны не будзе трэба, і падатку меней плаціць»[6]. Амаль усе, хто прысутнічаў на сходзе, запісаліся ў МОПР. Рэзалюцыі пратэсту супраць вайны, прынятыя на сялянскіх сходах, сведчаць аб глыбокай зацікаўленасці сялян у захаванні міру, разуменні імі неабходнасці сумесных дзеянняў працоўных усіх краін у барацьбе супраць пагрозы вайны. У іх нязменна ёсць заклік да пралетарыяту замежных краін рашуча весці барацьбу супраць буржуазіі, актыўна ўдзельнічаць у антываенным руху.

Такім чынам, выступленні працоўных БССР супраць ваеннай пагрозы у перыяд антываеннага «тыдня» мелі масавы і паўсюдны характар. Яны выявілі антываенны настрой насельніцтва Беларусі. Класавая салідарнасць з рэвалюцыйнай барацьбой замежнага пралетарыяту — лейтматыў рэзалюцый пратэсту антываенных сходаў і мітынгаў. Хваля антываеннага руху ў Беларусі з'яўлялася адначасова хваляй пралетарскай салідарнасці. Рабочыя і сяляне БССР таксама выказвалі заклапочанасць аб належнай абароназдольнасці СССР як важнейшай умове захавання міру, праяўлялі гатоўнасць сваёй працай умацоўваць эканамічны патэнцыял краіны, братэрскі саюз народаў СССР.

Тлумачальная работа КП(б)Б у дні «антываеннага тыдня» зыходзіла з тэзіса, што вайна з капіталістычным светам з'яўляецца практычна непазбежнай з-за варожасці імперыялістычных колаў да краіны Саветаў. Задача заключалася ў тым, каб адцягнуць яе. Зрабіць жа вайну немагчымай, папярэдзіць яе можа толькі перамога сусветнай пралетарскай рэвалюцыі, садзейнічаць якой — рэвалюцыйны доўг працоўных. Такі падыход у той час з'яўляўся пануючым у РКП(б).

[1] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 7, спр. 18, арк. 119, 120.
[2] Сталин И. В. Соч. Т. 6. С. 282.
[3] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 7, спр. 32, арк. 39.
[4] Звезда. 1924. 5 авг.
[5] Там жа. 14 авг.
[6] Там жа. 15 авг.